УДК 348:271.2:347.6 (476): [271.2–732.3 (476.2)]

А. П. Грахоцкі

НОРМАЫ ЦАРКОЎНАГА ПРАВА Ў ШЛЮБАРАЗВОДНЫМ ПРАЦЭСЕ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст ст. (па матэрыялах Мінскай епархіі)

У XIX ст. у расійскім царкоўным дыскурсе дамінавала сакраменталісцкая канцэпцыя шлюбу, згодна з якой шлюб разглядаўся як правобраз саюза Хрыста і Царквы, як свяшчэннае таінства, «соединяющее мужа и жену для полного неделимого общения жизни и низводящее на них дары Божьей благодати»[1]. Гэтая канцэпцыя ў поўнай меры была ўспрынята імперскай афіцыйнай ідэалогіяй, якая вызначала сям'ю як адну з асноў сацыяльнай і палітычнай стабільнасці дзяржавы. У сувязі з гэтым імперскія ўлады былі зацікаўлены ва ўсталяванні інстытуцыянальнага кантролю за шлюбам і разводам. У першай палове XIX ст. рост адміністрацыйнага патэнцыялу Рускай Праваслаўнай Царквы дазволіў забяспечыць беспрэцэдэнтны кантроль за шлюбам. «Устав духовных консисторий» 1841 г. кадыфікаваў умовы, неабходныя для заключэння і скасавання шлюбу, вызначаў адпаведныя працэдуры. Расійскі правазнаўца І. Аршанскі адзначаў: «Нет ни одного законодательства, в котором церковная сторона брака преобладала бы в такой степени над гражданской или, лучше сказать, поглощала бы эту последнюю, как в законодательстве русском»[2].

Зыходзячы з гэтага намі пастаўлена задача разгледзець прымяненне нормаў царкоўнага права ў рэгуляванні шлюбаразводных адносін на беларускіх землях у другой палове XIX – пачатку XX ст ст. Пад прымяненнем права мы разумеем форму рэалізацыі права, паводле якой прававыя нормы адносна

Грахоцкі Аляксандр Паўлавіч *– аспірант кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права УА «ГДУ імя Ф. Скарыны». Сфера навуковых інтарэсаў – прававое становішча хрысціянскіх канфесій, расійская ўрадавая палітыка ў Беларусі ў др. п. XIX – п. XX ст. Мае шэраг публікацый па дадзенай тэматыцы.*

[1] *Суворов Н. Учебник церковного права. С. 349.*

[2] *Оршанский И. Г. Исследования по русскому праву... С. 260.*

канкрэтных выпадкаў рэалізуюцца кампетэнтнымі органамі. Такім чынам, у артыкуле аналізуюцца прававыя асновы рэгулявання працэсаў скасавання шлюбаў на прыкладзе судова-адміністрацыйнай практыкі Мінскай праваслаўнай епархіі. Храналагічныя рамкі даследавання ахопліваюць перыяд ад адмены прыгоннага права (1861 г.), калі распачалася прававая эмансіпацыя, у тым ліку і ў сферы шлюбных адносін, сялянскіх масаў, і да 1905 г., калі ў Расійскай імперыі, паводле высноў Г. Фрыза, распачаўся поўнамаштабны крызіс сям'і, які суправаджаўся беспрэцэдэнтным ростам колькасці разводаў[3].

Пытанні шлюбна-сямейнага права Расійскай імперыі атрымалі даволі шырокае адлюстраванне ў працах расійскіх дарэвалюцыйных правазнаўцаў. Сярод значнай колькасці даследаванняў можна вылучыць, напрыклад, работы І. Аршанскага, М. Гарчакова, С. Грыгароўскага, А. Загароўскага, К. Пабеданосцава. Праблемы царкоўнай юрысдыкцыі ў сферы шлюбаразводных адносін разглядаў адзін з найбуйнейшых дарэвалюцыйных спецыялістаў у галіне царкоўнага права М. Суворaў, гісторык імперскага права В. Латкін. У савецкі перыяд рэлігійныя нормы ў заканадаўстве Расійскай імперыі даследаваў В. Клачкоў. У сучаснай расійскай гістарыяграфіі да пытанняў кампетэнцыі духоўных судоў у Расійскай імперыі, у тым ліку і ў сферы шлюбаразводных адносін, звярталіся С. Рымскі, В. Жураўлёва. Праблема шлюбаў у асяродку расійскага дваранства, а таксама спецыфіка заключэння міжканфесійных шлюбаў у Расійскай імперыі адлюстравана ў працах В. Вярэменкі. Прымяненне нормаў сямейнага права Рымска-каталіцкай Царквы і Евангелічна-Лютэранскай Царквы ў Расійскай імперыі разгледжана ў доктарскай дысертацыі В. А. Ліцэнбергер. Асаблівай увагі заслугоўваюць артыкулы амерыканскага гісторыка-русіста Грэгары Фрыза. У сваім даследаванні Г. Фрыз разгледзеў фактычную манаполію сінадальнай царквы на кантроль за шлюбам і разводам у познаімперскі перыяд, паказаў секулярныя і рэлігійныя ўяўленні аб тагачаснай сям'і[4]. У беларускай жа гістарыяграфіі дадзеная праблема засталася па-за межамі ўвагі даследчыкаў.

РАСІЙСКАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА ПРЫЗНАВАЛА ТОЛЬКІ АДНУ ФОРМУ ЗАКЛЮЧЭННЯ ШЛЮБУ – ЦАРКОЎНУЮ

Расійскае заканадаўства прызнавала толькі адну форму заключэння шлюбу – царкоўную. У «Законах гражданских» адзначалася: « … брак же во всех вероисповеданиях терпимых в Российской Империи… признаётся законным, когда оный совершён по обрядам их веры и по установленным правилам» (арт. 1112)[5]. У заканадаўстве Расійскай імперыі

[3] *Фриз Г. Мирские нарративы о Священном таинстве… С. 122–136.*

[4] *Там жа.*

[5] *Законы гражданские. С. 95.*

нават адсутнічала азначэнне паняцця «шлюб». Прафесар Д. І. Мейер у сваёй працы «Русское гражданское право» так тлумачыў гэтую акалічнасць: «Змест шлюбу не вычэрпваецца падлікам усіх правоў і абавязкаў, якія вынікаюць са шлюбу, так што ў галіне права няма магчымасці даць поўнае азначэнне шлюбнаму союзу, і паняцце пра яго ўстанаўліваецца па-за межамі права, у галіне рэлігіі і маралі»[6].

[6] *Клочков В. В. Закон и религия... С. 91–92.*

«Устав духовных консисторий» 1841 г. кадыфікаваў умовы, неабходныя для разводу і вызначаў яго працэдуру. У дакуменце пералічваліся наступныя падставы для разводу: ссылка аднаго з сужэнцаў у Сібір з пазбаўленнем усіх правоў стану, працяглае невядомае месцазнаходжанне мужа ці жонкі, «неспособность к брачному сожитию», пралюбадзейства (арт. 230, 241). Акрамя гэтых падстаў у «Законах гражданских» вызначалася магчымасць атрымання разводу ў выпадку, калі адзін з сужэнцаў-нехрысціян прымаў праваслаўе, а другі не жадаў працягваць з ім сужэнства (арт. 45, 79–81, 83). У выпадку, калі «новаахрышчаны» меў некалькі жонак, ён павінны быў застацца ў шлюбе толькі з адной. Гэтая ж норма распаўсюджвалася і на жанчын-неафітак, якія мелі некалькіх мужоў (арт. 82). Апошняй падставай для атрымання разводу асобамі праваслаўнага веравызнання ў расійскім заканадаўстве вызначалася прыняцце манаства. Згодна з артыкулам 413 «Законов о состояниях» паступленне ў манаства з'яўлялася прычынай для скасавання шлюбу толькі ў выпадку, калі абодва сужэнцы прымалі манаскі пострыг. Паступленне ж у манаства толькі аднаго сужэнца не дазвалялася і не лічылася падставай для разводу. Калі ж абодва сужэнцы вырашалі пастрыгчыся ў манахі, закон патрабаваў, каб яны дасягнулі вызначанага ўзросту (не менш за 50 год[7]) і не мелі малалетніх і «требующих родительского призрения» дзяцей[8].

ПЕРШАЙ СТАДЫЯЙ ШЛЮБАРАЗВОДНАГА ПРАЦЭСУ БЫЛА ПАДАЧА Ў ДУХОЎНУЮ КАНСІСТОРЫЮ ПРАШЭННЯ АД МУЖА ЦІ ЖОНКІ, ДЗЕ ВЫКЛАДАЛАСЯ КАНКРЭТНАЯ НАГОДА ДЛЯ РАЗВОДУ

[7] *Суворов Н. Учебник церковного права. С. 389.*

[8] *Законы о состояниях. С. 51.*

Першай стадыяй шлюбаразводнага працэсу была падача ў духоўную кансісторыю прашэння ад мужа ці жонкі, дзе выкладалася канкрэтная нагода для разводу. Просьбіт выплочваў гербавы збор, адпаведныя пошліны, прыкладаў копію пасведчання аб шлюбе і іншыя неабходныя для справы дакументы[9]. Выкананне вышэй адзначаных фармальнасцей было прынцыповым дзеля далейшага ходу справы. Даволі часта іскі аб разводзе падаваліся не на гербавай паперы ці ісцец не выплочваў пошліну[10]. У некаторых прашэннях не было інфармацыі пра месца і дату заключэння шлюбу[11]. Усё гэта было падставай для прыпынення ходу справы да таго часу, пакуль просьбіт не выканае адпаведныя патрабаванні.

[9] *Устав духовных консисторий. Ст. 242; Григоровский С. О разводе... С. 158.*

[10] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 30104. Арк. 3; Прошения разных лиц о расторжении брака... Л. 58, 80–87.*

[11] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 30284. Арк. 2.*

Другім этапам было «увещание» для прымірэння: мясцовы святар угаворваў мужа і жонку прыйсці да згоды і адклікаць прашэнне. Трэба адзначыць, што ў рэдкіх выпадках у святароў атрымлівалася ўгаварыць сужэнцаў захаваць шлюб. Так, напрыклад, сялянка М. Мельнікава, якая падала іск аб разводзе па прычыне імпатэнцыі мужа, адклікала сваё прашэнне пасля «внушений» мясцовага духоўніка[12]. Калі ж сужэнцы адмаўляліся прымірыцца, кансісторыя спачатку прызначала «судагаварэнне» (праводзілася толькі тады, калі прычынай разводу было пралюбадзейства), затым праводзілася расследаванне абставін справы[13]. Пасля правядзення следства кансісторыя рыхтавала даклад па справе і фармулявала рашэнне, якое падавалася на разгляд епархіяльнаму архірэю[14]. Той мог зацвердзіць ці адхіліць рашэнне кансісторыі. Калі прашэнне аб разводзе атрымлівала ўхваленне епіскапа, справа накіроўвалася ў Сінод на канчатковы разгляд і зацвярджэнне[15].

Звернемся да разгляду прычын разводу. У царкоўным дыскурсе *пралюбадзейства* лічылася адным з самых цяжкіх смяротных грахоў. Гэты грэх ставіўся ў адзін шэраг з забойствам і вераадступніцтвам. С. Грыгароўскі, спасылаючыся на Біблію, адзначаў, што сам Хрыстос дазволіў развод па прычыне «парушэння шлюбнай вернасці пралюбадзействам»[16]. Расійскае заканадаўства аб разводзе вызначала пралюбадзейства як «внебрачное плотское совокупление»[17].

Згодна з заканадаўствам справы аб пралюбадзействе мелі дваістую падсуднасць. «Зняважаны пралюбадзействам сужэнец» мог падаць іск альбо ў свецкі, альбо ў духоўны суд[18]. Аднак забаранялася падаваць іск у абодва суды, каб не дапусціць падвоенага пакарання за адно і тое ж злачынства. Калі «зняважаны сужэнец» не дамагаўся разводу, але жадаў, каб «сужэнец-здраднік» панёс крымінальнае пакаранне, першы звяртаўся ў крымінальны суд. Паводле «Уложения о наказаниях…» асоба, вінаватая ў пралюбадзействе, падлягала заключэнню ў манастыр ці ў турму на тэрмін ад чатырох да васьмі месяцаў і царкоўнаму пакаянню. Гэтаксама і асоба, з якой было «учинено прелюбодеяние», у выпадку, калі яна не знаходзілася ў шлюбе, прыгаворвалася да турэмнага зняволення на тэрмін ад двух да чатырох месяцаў ці да арышту на час ад трох тыдняў да трох месяцаў (арт. 1585). Калі ж сужэнец жадаў атрымаць развод, іск падаваўся ў духоўны суд. Так, селянін Філіп Насевіч падаў іск аб разводзе па прычыне пралюбадзейства жонкі з яго родным бацькам. У рашэнні кансісторыі адзначалася, што Ф. Насевіч ужо падаваў іск па гэтай справе ў крымінальны

[12] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 35432. Арк. 2–11.*

[13] *Устав духовных консисторий. Ст. 243.*

[14] *Там жа. Арт. 255, 257.*

[15] *Там жа. Арт. 259.*

[16] *Григоровский С. О разводе… С. 21.*

[17] *Там жа. С. 22.*

[18] *Устав уголовного судопроизводства. Ст. 1016.*

суд. Згодна з прыгаворам свецкага суда бацька Насевіча быў адпраўлены на год і шэсць месяцаў у папраўчыя арыштанцкія роты, а жонка атрымала адзін год турэмнага зняволення. У сувязі з гэтым кансісторыя пастанавіла, што Ф. Насевіч страціў права падачы іску ў духоўны суд[19].

У царкоўных судах шлюбаразводныя справы аб пралюбадзействе складалі адзіны род спраў, паводле якіх прадугледжвалася «судагаварэнне» з абавязковым выклікам сужэнцаў у кансісторыю[20]. Падчас «судагаварэння» адказчыка распытвалі пра абставіны, выкладзеныя ў іскавым прашэнні, затым адказчыку давалася магчымасць абвергнуць доказы ісца і прадстаўляць свае дакументы[21]. Удзел у працэсе даверaных асоб дазваляўся толькі ў выпадку хваробы ісца ці адказчыка (прычым факт захворвання пацвярджаўся ўрачэбным аддзяленнем губернскага праўлення) альбо ў выпадку адсутнасці сужэнца «з-за службовых спраў» ці па іншых уважлівых прычынах, але толькі з асабістага дазволу епархіяльнага начальства[22].

Духоўны суд падчас разгляду справы абапіраўся на тэорыю «фармальных доказаў», згодна з якой усе доказы падзяляліся на галоўныя і другасныя. Галоўнымі прызнаваліся паказанні двух ці трох сведкаў-відавочцаў; нараджэнне дзяцей па-за законным шлюбам. Другаснымі доказамі лічыліся «любоўныя пісьмы», паказанні сведкаў, якія не былі непасрэднымі відавочцамі «злачынства», асабістае прызнанне вінаватай асобы. Другасныя доказы мелі юрыдычную сілу толькі ў тым выпадку, калі яны спалучаліся з адным з галоўных доказаў[23]. Такім чынам, толькі непасрэдныя паказанні сведкаў, якія на свае вочы бачылі здзяйсненне палавога акта, маглі гарантаваць развод. У сувязі з гэтым тагачасныя спецыялісты ў галіне сямейнага і царкоўнага права гаварылі пра праблему павальнага подкупу сведкаў[24]. Так, нейкі аўтар у часопісе «Церковно-общественный вестник» з абурэннем пісаў: «Во всяком почти бракоразводном деле фигурирует бракоразводных дел мастер, за высокую цену устраивающий достоверность, улаживающий дело с каким-нибудь столоначальником или секретарём Консистории и подбирающий свидетелей из подонков общества. Сами судьи часто знают это, но они обязаны верить наглому надувательству, если только соблюдены все требуемые законом условия»[25]. Так, напрыклад, судовая справа аб разводзе паміж Юзэфай і Іванам Каласоўскімі паказвае многія заганы тагачаснага шлюбаразводнага працэсу[26]. Справа Каласоўскіх цягнулася больш за 5 гадоў (з чэрвеня 1864 г. па снежань 1869 г.). У адказ на іск сваёй жонкі аб разводзе «па прычыне пралюбадзейства

[19] *Дело о запрещении разным лицам расторжения брака. Л. 51–54.*

[20] *Устав духовных консисторий. Ст. 248.*

[21] *Там жа. Арт. 250.*

[22] *Суворов Н. Учебник церковного права. С. 316.*

[23] *Устав духовных консисторий. Ст. 252, 253.*

[24] *Суворов Н. Учебник церковного права. С. 316; Григоровский С. О разводе... С. 44–45.*

[25] *Загоровский А. И. Курс семейного права. С. 137.*

[26] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 30740.*

мужа» І. Каласоўскі, не згаджаючыся на развод, звярнуўся ў кансісторыю з сустрэчным прашэннем, дзе адзначаў, што «на самой справе» гэта Юзэфа неаднаразова яму здраджвала[27]. У выпадку, калі кансісторыя прызнавала вінаватымі ў пралюбадзействе абодвух сужэнцаў, шлюб заставаўся ў сіле[28] Верагодна, менавіта на гэта і спадзяваўся Каласоўскі. Абодва бакі прадставілі сваіх сведкаў. І. Каласоўскі абвінаваціў двух сведкаў жонкі ў тым, што тыя з'яўляліся яе палюбоўнікамі, таму іх сведчанні не могуць быць прынятыя судом да ўвагі[29]. У сваю чаргу сведка Каласоўскага Масюкевіч прызнаўся падчас допыту, што першы прапаноўваў яму тры рублі за ілжывае сведчанне аб пралюбадзействе яго жонкі[30]. У выніку духоўны суд пастанавіў: у сувязі з тым, што ніхто са сведкаў не бачыў непасрэднага здзяйснення палавога акта І. Каласоўскага з «рэкруткай» Х. Карповіч, адмовіць Ю. Каласоўскай у «просьбе» аб скасаванні шлюбу[31]. А вось шлюбаразводная справа паміж Марыяй і Леанідам Малькоўскімі з'яўляецца адваротным прыкладам даволі хуткага і аднадушнага судовага працэсу. 8 верасня 1896 г. М. Малькоўская падала іск аб разводзе па прычыне пралюбадзейства мужа. Л. Малькоўскі прызнаў сваю віну. Два сведкі, прадстаўленыя жонкай, пацвердзілі, што бачылі, як Малькоўскі «лежит на кровати на какой-то женщине хорошо одетой, красивой, полной и совокупляется с нею». Ужо 6 кастрычніка 1897 г. Мінская духоўная кансісторыя вынесла рашэнне аб разводзе і асудзіла Л. Малькоўскага на адбыванне сямігадовага царкоўнага пакаяння і «на всегдашнее безбрачие»[32]. 4 чэрвеня 1898 г. Сінод зацвердзіў гэтае рашэнне[33].

Прывядзём яшчэ адзін характэрны прыклад. Барысаўскі павятовы спраўнік І. Пісараў падаў іск аб разводзе па прычыне пралюбадзейства жонкі. У прашэнні адзначалася, што яго жонка пакінула свайго мужа і з'ехала «неизвестно куда» з паручнікам К. Э. Кірхагіані. У якасці доказу Пісараў прыкладаў два лісты, атрыманыя ад жонкі, у якіх тая тлумачыла мужу, што пакахала іншага чалавека і не збіраецца вяртацца дадому[34]. Кансісторыя падала наступны адказ на гэты іск: згодна з «Уставом духовных консисторий» павінна адбыцца «увещание» сужэнцаў, каб яны «прекратили несогласие христианским примирением и оставались в брачном союзе», калі ж «увещание не достигнет цели» неабходна перайсці да «фармальнага справаводства». Аднак дзеля правядзення гэтых дзеянняў неабходна ведаць месцажыхарства сужэнцаў. Таму Мінская духоўная кансісторыя прапанавала Пісараву паведаміць месцажыхарства жонкі[35].

[27] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 30740. Арк. 1–2 ад., 6–7.*

[28] *Григоровский С. О разводе... С. 37.*

[29] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 30740. Арк. 100 ад.*

[30] *Там жа. Арк. 103.*

[31] *Там жа. Арк. 109.*

[32] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 36600. Арк. 6–11.*

[33] *Там жа. Арк. 57.*

[34] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 31871. Арк. 3–12 ад.*

[35] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 31871. Арк. 13 ад.*

Як паказваюць матэрыялы Мінскай духоўнай кансісторыі, найбольш распаўсюджанай падставай для разводу ў адзначаны перыяд з'яўлялася *адсутнасць без вестак аднаго з сужэнцаў*. Згодна з «Уставом духовных консисторий» шлюбаразводныя справы па гэтай прычыне распачыналіся кансісторыяй толькі ў выпадку, калі сужэнец адсутнічаў без вестак як мінімум на працягу пяці гадоў (арт. 233). Пасля атрымання прашэння аб разводзе кансісторыя пачынала пошук зніклага сужэнца (арт. 234). Трэба адзначыць, што пошукавыя мерапрыемствы мелі даволі сур'ёзны характар: ладзіўся допыт родных, сваякоў, аднавяскоўцаў аб месцазнаходжанні зніклага, дасылаліся запыты ў дзяржаўныя службы, якія займаліся рэгістрацыяй жыхарства, у «Губернских ведомостях» (з 1895 г. – у «Церковном вестнике») друкаваліся аб'явы аб пошуку зніклых без вестак. Як толькі кансісторыя атрымлівала інфармацыю аб месцазнаходжанні зніклага сужэнца, справа тут жа спынялася і шлюб заставаўся ў сіле[36]. Г. Фрыз у сваім артыкуле прыводзіць цікавы факт са шлюбаразводнай практыкі Літоўскай епархіі: кансісторыя адмовіла селяніну ў разводзе ў сувязі з тым, што было выяўлена месцажыхарства яго жонкі. Высветлілася, што яна эміграваала ў ЗША[37].

У выпадку, калі знайсці зніклага сужэнца не ўдавалася, распачынаўся разгляд справы ў кансісторыі. Як правіла, разгляд гэтых спраў у Мінскай духоўнай кансісторыі зацягваўся на 3–4 гады. Напрыклад, селянін Д. Баран атрымаў развод з жонкай, якая адсутнічала без вестак на працягу дванаццаці гадоў, праз чатыры гады пасля падачы іску[38]. Г. Шанц быў разведзены са сваёй жонкай (яна адсутнічала без вестак больш за 20 гадоў) за 3 гады[39]. Селяніну І. Чырыку пашанцавала атрымаць развод праз паўтара гады пасля падачы іску[40].

14 студзеня 1895 г. выйшла «Высочайшее повеление» аб новых правілах скасавання шлюбу па прычыне адсутнасці без вестак аднаго з сужэнцаў. Дадзеныя правілы ўводзілі некаторыя змены ў шлюбаразводны працэс: у выпадку вынясення рашэння аб разводзе зніклы сужэнец не прысуджаўся да «всегдашнего безбрачия», як гэта было раней, гэтае пытанне адкладалася да моманту выяўлення яго месцазнаходжання; вызначаўся тэрмін вышуку зніклага сужэнца – адзін год; па справах аб разводзе месцічаў і сялян па прычыне іх адсутнасці без вестак апошняй інстанцыяй абвяшчаўся епархіяльны архірэй, то бок гэтыя справы не адпраўляліся на зацвярджэнне Сінода[41]. З 1903 г. усе шлюбаразводныя справы па прычыне

[36] *Устав духовных консисторий. Ст. 237.*

[37] *Фриз Г. Мирские нарративы о Священном таинстве... С. 171.*

[38] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 30360. Арк. 1–28 ад.*

[39] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 30912. Арк. 1–24.*

[40] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 30735. Арк. 1–19.*

[41] *Григоровский С. О разводе... С. 151–157.*

адсутнасці сужэнца без вестак атрымлівалі канчатковае вырашэнне на епархіяльным узроўні[42].

Больш аператыўна, у параўнанні з іншымі справамі, у Мінскай духоўнай кансісторыі адбываўся разгляд шлюбаразводных спраў па прычыне *ссылкі аднаго з сужэнцаў у Сібір з пазбаўленнем усіх правоў стану*. Справы аб разводзе з ссыльнымі ў выпадках, калі крымінальны суд ужо пазбавіў сужэнца ўсіх правоў стану і вынес прыгавор аб ссылцы, атрымлівалі аўтаматычнае зацвярджэнне ў кансісторыі. Сужэнцу, які не жадаў накіроўвацца ў ссылку разам са сваім асуджаным сужэнцам, неабходна было толькі прадставіць у кансісторыю прашэнне аб разводзе, выпіску з метрычнай кнігі аб заключэнні шлюбу і копію прыгавора крымінальнага суда. Так, сялянка Ф. Куляшова атрымала развод са сваім мужам, які быў сасланы на катаржныя работы ў Сібір за забойства ляснога вартаўніка і крадзеж дроў, праз 5 месяцаў з моманту падачы прашэння[43].

У расійскім крымінальным праве вылучалася тры галоўныя віды ссылкі: 1) ссылка на катаржную работу ў руднікі, на заводы, фабрыкі і іншыя работы ў Сібіры і на востраве Сахалін; 2) ссылка на пасяленне ў «больш ці менш аддаленыя» раёны Сібіры ці ў Закаўказзе; 3) ссылка «на жыццё» ў Сібірскія і іншыя аддаленыя губерні. Першыя два віды ссылкі прадугледжвалі пазбаўленне вінаватага ўсіх правоў стану, г. зн. і сямейных правоў, а трэці від (ссылка «на жыццё») пазбаўляў вінаватага толькі ўсіх «особенных, лично и по состоянию его, присвоенных ему прав и преимуществ», гэта значыць, што прыгавор не тычыўся яго сямейных і маёмасных правоў[44]. Так, напрыклад, Мінская духоўная кансісторыя адмовіла ў скасаванні шлюбу паміж сялянкай Н. Грынкевіч і яе мужам, які быў сасланы ў Сібір за крадзеж сялянскай маёмасці. У рашэнні духоўнага суда адзначалася: «Гринкевич … лишён только всех особенных лично и по состоянию присвоенных прав и преимуществ, а не всех прав состояния, при каковом решении, права семейственные … сохраняют свою силу»[45]. Па невядомых нам прычынах гэтае рашэнне выйшла толькі праз 6 год пасля падачы сялянкай іску. Матэрыялы, якія змяшчаюцца ў гэтай архіўнай справе, дазваляюць гаварыць аб тым, што ўсе неабходныя для разгляду справы дакументы былі атрыманы кансісторыяй разам з іскам[46]. Відавочна, што на працягу шасці гадоў прашэнне ляжала ў кансісторыі без разгляду.

У 1892 г. Аляксандр III падпісаў закон, які рэгуляваў парадак скасавання шлюбаў ссыльных асоб. Гэты закон дазваляў

[42] *Григоровский С. О разводе… С. 157.*

[43] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 30548. Арк. 6–9.*

[44] *Григоровский С. О разводе… С. 56–57.*

[45] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 30757. Арк. 19–22.*

[46] *Там жа. Арк. 1–18.*

развод і па прычыне ссылкі сужэнца «на жыццё» ў Сібір, а таксама прадугледжваў магчымасць падачы прашэння аб разводзе і самім ссыльным у выпадку, калі яго сужэнец адмовіўся накіроўвацца разам з ім у месца ссылкі. Аднак асуджаныя мелі права на падачу іску толькі пасля заканчэння вызначанага ў адпаведнасці з заканадаўствам тэрміну: ад аднаго да трох гадоў з дня ўступлення прыгавора ў законную сілу[47]. Шлюбаразводныя справы па прычыне ссылкі аднаго з сужэнцаў, як і справы аб адсутнасці сужэнца без вестак, канчаткова вырашаліся епархіяльным архірэем без зацвярджэння Сінода[48].

Пад *няздольнасцю аднаго з сужэнцаў да «брачного сожития»* ў расійскім прававым і царкоўным дыскурсе разумелася «исключительно физическая неспособность к отправлению полового акта»[49]. С. Грыгароўскі ў сваёй манаграфіі пісаў: «Ніякія іншыя фізічныя ці маральныя дэфекты, як, напр., вар'яцтва, шаленства, пакута на венерычныя і іншыя заразлівыя невылечныя хваробы, якія робяць de facto сужэнскае жыццё немагчымым або безумоўна небяспечным для фізічнага і маральнага здароўя другога сужэнца, а таксама магчымага ад такога жыцця патомства, не ўваходзіць у паняцце той няздольнасці, якую мае на ўвазе закон, як прычыну разводу»[50]. Больш за тое, заканадаўства вызначыла дзве важнейшыя ўмовы, згодна з якімі можна было разлічваць на развод па прычыне няздольнасці сужэнца да здзяйснення палавога акта. Па-першае, «няздольнасць» прызнавалася падставай для разводу толькі ў тым выпадку, калі сужэнец пакутаваў на яе яшчэ да моманту ўзяцця шлюбу[51]. Па-другое, іск аб разводзе мог быць пададзены толькі «невінаватым» (г. зн. здаровым) сужэнцам (мужам ці жонкай) праз тры гады пасля заключэння шлюбу[52]. «Вінаваты» ж сужэнец, г. зн. хворы на імпатэнцыю, у выпадку вынясення рашэння аб разводзе асуджаўся духоўным судом на «всегдашнее безбрачие»[53]. Рашэнне духоўнага суда грунтавалася на заключэнні ўрачэбнага аддзялення губернскага праўлення. Па сутнасці, медыцынскі агляд сужэнца, які «абвінавачваўся» ў «няздольнасці», з'яўляўся адзінай падставай для вынясення судовага рашэння па справе[54]. Так, жыхарка сяла Бягомль Барысаўскага павета Марцэля Ковель падала ў Мінскую духоўную кансісторыю іск аб разводзе. У іску адзначалася, што, «не будучи в силах снесть разжигание плоти», яна просіць скасаваць яе шлюб з Міхаілам Ковелем (якому на той час было 25 гадоў) «по причине не способности его к супружеской жизни»[55]. Згодна з рашэннем кансісторыі Ковель быў накіравана на медыцынскі

[47] *Григоровский С. О разводе... С. 60–61, 147.*

[48] *Там жа. С. 62.*

[49] *Григоровский С. О разводе... С. 66; Суворов Н. Учебник церковного права. С. 356.*

[50] *Григоровский С. О разводе... С. 66–67.*

[51] *Устав духовных консисторий. Ст. 246; Законы гражданские. Ст. 49.*

[52] *Там жа. Арт. 245.*

[53] *Там жа. Арт. 256.*

[54] *Там жа. Арт. 247.*

[55] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 31227. Арк. 1 і ад.*

агляд у Мінскую ўрачэбную ўправу. У акце медыцынскай экспертызы мінскія ўрачы да самых дробязей апісалі фізіялагічныя асаблівасці пацыента. У заключэнні ж адзначалася: «Судя по вышеописанному слабому телосложению и недостаточности развития половых органов, члены врачебной управы заключают, что сельский обыватель Михаил Ковель не может вполне считаться неспособным к супружескому сожитию, тем более что при освидетельствовании он заявил о неоднократном супружеском сношении с женою»[56]. На падставе медыцынскага заключэння духоўны суд адмовіў Марцэлі Ковель у прашэнні аб разводзе[57].

Акрамя таго, згодна з «определениями» Сінода (1851, 1853, 1855 г. і інш.) у некаторых выпадках, калі ў імпатэнцыі «абвінавачваўся» муж, медыцынскаму агляду падлягала таксама і жонка «на предмет определения нахождения её в девственном состоянии»[58].

Фармальна на развод па гэтай прычыне маглі разлічваць і мужчыны, якія «абвінавачвалі» сваіх жонак у няздольнасці да «брачного сожития». Так, мешчанін Аляксандр Пашкоўскі ў прашэнні аб разводзе адзначаў, што яго жонка няздольная «к супружеской жизни … в виду появления у неё болезни неудержания мочи»[59]. Селянін Маісей Дубовік патрабаваў разводу з жонкай, якая пакутавала ад «безупыннага крывацёку»[60]. Аднак ні першы, ні другі ісцец не атрымаў дазволу на развод.

Трэба адзначыць, што ў Мінскую духоўную кансісторыю паступала даволі шмат іскаў, у якіх жанчыны патрабавалі скасавання шлюбу па прычыне «жорсткага» абыходжання з імі мужа. Напрыклад, Еўдакія Парыч у сваім прашэнні пісала, што муж « … с первого года брака … начал обращаться со мной сурово и жестоко, бил меня, издевался разным образом надо мною»[61]. Не менш іскаў паступала і ад мужчын, якія хацелі атрымаць развод са сваімі жонкамі па прычыне таго, што апошнія пакінулі іх і не жадалі жыць разам. Аднак адказ кансісторыі на такія прашэнні быў шаблонны: «Причина жестокого обращения и оставление одного из супругов не предусмотрены для развода»[62].

Такім чынам, важнейшыя структурныя палажэнні шлюбна-сямейнага права Расійскай імперыі грунтаваліся на кананічных нормах. На беларускіх землях, як і ў іншых рэгіёнах імперыі, прававая рэгламентацыя скасавання шлюбу ажыццяўлялася на падставе нормаў царкоўнага права той рэлігіі, да якой належалі асобы, што ўступалі ў матрыманіяльныя адносіны[63]. У расійскім прававым дыскурсе нават адсутнічала

[56] *НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 31227. Арк. 18.*

[57] *Там жа. Арк. 19–20.*

[58] *Григоровский С. О разводе… С. 140.*

[59] *Прошения разных лиц о расторжении брака… Л. 33, 46.*

[60] *Там жа. Арк. 34–38 ад.*

[61] *Там жа. Арк. 66.*

[62] *Дело о запрещении разным лицам расторжения брака. Л. 16–17.*

[63] *Пытанне аб прававым рэгуляванні міжканфесійных шлюбаў вынесена за межы нашага даследавання.*

азначэнне паняцця «шлюб». Шлюб разглядаўся заканадаўствам як царкоўнае таінства. У сувязі з гэтым у імперскім праве адбылася інкарпарацыя кананічных нормаў у сферу цывільнага заканадаўства. Пытанні скасавання шлюбу асобаў праваслаўнага веравызнання рэгуляваліся нормамі царкоўнага права Рускай Праваслаўнай Царквы. Гэтыя нормы змяшчаліся, перад усім, ва «Уставе духовных консисторий» і «Законах гражданских». У гэтых заканадаўчых актах вызначаўся вычарпальны спіс прычын для разводу. Толькі царкоўныя органы – духоўныя кансісторыі на чале з епархіяльнымі архірэямі (першая інстанцыя) і Сінод (другая інстанцыя) – мелі права вырашэння пытанняў аб скасаванні шлюбу. Кансерватыўнасць Рускай Праваслаўнай Царквы, негатыўнае ўспрыняцце ёю новаўвядзенняў не дазволілі ўвесці ў шлюбаразводную практыку духоўных кансісторый такія важнейшыя прынцыпы судовага працэсу, як галоснасць, вуснасць, спаборнасць бакоў. Забюракратызаванасць шлюбаразводнага працэсу, жорсткая рэгламентацыя падстаў для скасавання шлюбу рабілі развод надзвычай доўгатэрміновай, амаль невыканальнай працэдурай, што непазбежна выклікала незадаволенасць насельніцтва.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Суворов, Н. Учебник церковного права / Н. Суворов. – М., 1912. – 531 с.
2. Оршанский, И. Г. Исследования по русскому праву обычному и брачному / И. Г. Оршанский. – СПб., 1879. – 456 с.
3. Freze, G. L. Brining Order to the Russian Family: Marriage and Divorce in Imperial Russia, 1760–1860 / G. L. Freze // Journal of Modern History. – 1990. – Vol. 62. – P. 709–748.
4. Фриз, Г. Мирские нарративы о Священном таинстве: брак и развод в позднеимперской России / Г. Фриз // Православие: Конфессия, институты, религиозность (XVII – XX вв.): сб. науч. работ / Европейский ун-т в Санкт-Петербурге; под ред. М. Долбилова, П. Рогозного. Сер. Источник. Историк. История. – СПб., 2009. – Вып. 6. – С. 122–175.
5. Горчаков, М. О тайне супружества / М. Горчаков. – СПб., 1880. – 384 с.
6. Григоровский, С. О разводе. Причины и последствия развода и бракоразводное судопроизводство. Историко-юридические очерки / С. Григоровский. – СПб., 1911. – 344 с.
7. Загоровский, А. О разводе по русскому праву / А. Загоровский. – Харьков, 1884. – 490 с.
8. Загоровский, А. И. Курс семейного права / А. И. Загоровский; под ред. В. А. Томсинова. – М.: Зерцало, 2003. – 464 с.

9. Победоносцев, К. Курс гражданского права: в 2 ч. / К. Победоносцев. – СПб., 1896. – Ч. 2: Права семейственные, наследственные и завещательные. – 676 с.

10. Латкин, В. Н. Учебник истории русского права периода империи (XVIII – XIX стст.) / В. Н. Латкин. – СПб., 1908. – 644 с.

11. Клочков, В. В. Закон и религия (от государственной религии в России к свободе совести в СССР) / В. В. Клочков. – М.: Политиздат, 1982. – 160 с.

12. Римский, С. В. Российская церковь в эпоху Великих реформ (Церковные реформы в России 1860–1870-х годов) / С. В. Римский. – М.: Крутицкое Патриаршее Подворье, 1999. – 567 с.

13. Журавлёва, О. М. Церковно-судебная практика в Московской епархии в первой половине XIX века / О. М. Журавлёва // Православие: Конфессия, институты, религиозность (XVII – XX вв.): сб. науч. работ / Европейский ун-т в Санкт-Петербурге; под ред. М. Долбилова, П. Рогозного. Сер. Источник. Историк. История. – СПб., 2009. – Вып. 6. – С. 105–121.

14. Веременко, В. А. Эволюция дворянской семьи в условиях модернизации России (вторая половина XIX – начало XX в.): автореф. дисс. … д-ра историч. наук: 07.00.02 / В. А. Веременко; Рос. гос. пед. ун-т им. А. И. Герцена. – СПб., 2007. – 50 с.

15. Веременко В. А. Межконфессиональные браки в России во второй половине XIX – начале XX в. / В. А. Веременко // Гендер и общество в истории / Под ред. Л. П. Репиной [и др.]. – СПб.: Алатейя, 2007. – С. 202–241.

16. Лиценбергер, О. А. Римско-католическая и евангелическо-лютеранская церкви в России: сравнительный анализ взаимоотношений с государством и обществом (XVIII – нач. XX в.): автореф. дисс. … д-ра историч. наук: 07.00.02 / О. А. Лиценбергер; Саратовский гос. ун-т им. Н. Г. Чернышевского. – Саратов, 2005. – 38 с.

17. Лиценбергер, О. А. Применение норм семейного права Римско-католической церкви в Российской империи // Религия и право. – 2003. – № 1. – С. 34–37.

18. Законы гражданские // Свод законов Российской империи: в 16 т. – СПб., 1900. – Т. 10, ч. 1.

19. Устав духовных консисторий. – СПб., 1857. – 134 с.

20. Законы о состояниях // Свод законов Российской империи: в 16 т. – СПб., 1899. – Т. 9, ч. 1.

21. Дело о разрешении крестьянке д. Семенчицы Минского уезда Ф. Кулешовой вступить во второй брак в связи со ссылкой мужа на каторгу // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 30104.

22. Дело по прошению крестьянки Речицкого уезда Ю. Подсосонной о разрешении вступить во второй брак в связи с многолетним отсутствием первого мужа // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 30284.

23. Прошения разных лиц о расторжении брака в связи с неспособностью к брачному сожитию, ссылкой в Сибирь и многолетним отсутствием одного из супругов // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 36813.

24. Дело по прошению крестьянки села Залужье Бобруйского уезда М. Мельниковой о разводе в связи с болезнью мужа // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 35432.

25. Устав уголовного судопроизводства // Свод законов Российской империи: в 16 т. – СПб., 1876. – Т. 15, ч. 2.

26. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных // Свод законов Российской империи: в 16 т. – СПб., 1885. – Т. 15.

27. Дело о запрещении разным лицам расторжения брака // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 36870.
28. Дело по прошению о расторжении брака жительницы деревни Мокраны Слуцкого уезда Ю. Фоминой с И. Колосовским в связи с нарушением последним святости брака // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 30740.
29. Дело по прошению жительницы г. Минска М. Мальковской о расторжении брака в связи с ведением мужем аморального образа жизни // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 36600.
30. Дело по прошению Борисовского уездного исправника И. Писарева о разводе в связи с аморальным образом жизни жены // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 31871.
31. Дело о разрешении крестьянину Мозырского уезда Д. Барану вступить во второй брак в связи с многолетним отсутствием первой жены // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 30360.
32. Дело о разрешении прихожанину Телушской церкви Бобруйского уезда Г. Шанцу вступить во второй брак в связи с многолетним отсутствием первой жены // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 30912.
33. Дело о разрешении крестьянке села Витчовка Пинского уезда П. Войтович вступить во второй брак в связи с многолетним отсутствием первого мужа // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 30480.
34. Дело о разрешении крестьянину деревни Дюрдево Речицкого уезда И. Чирику вступить во второй брак в связи с многолетним отсутствием первой жены // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 30735.
35. Дело по обвинению отставного квартирмейстера Уланского полка жителя г. Новогрудка Ф. Бейера в двоеженстве // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 30548.
36. Дело по прошению крестьянки Игуменского уезда Н. Гринкевич о разрешении ей вступить во второй брак в связи со ссылкой первого мужа на каторгу в Сибирь // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 30757.
37. Дело по прошению жительницы с. Бегомль Борисовского уезда М. Ковель о разводе с мужем в связи с его болезнью // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 31227.
38. Дело о запрещении консистории расторжения браков разным лицам // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 36962.

Дата паступлення ў рэдакцыю 29.05.2010.